✓**17 сакавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшло адкрыццё гісторыка-дакументальнай выставы **«Шлях да Перамогі: гістарычныя крыніцы сведчаць»**, прымеркаванай да 75-годдзя вызвалення Усходняй Еўропы ад нацызму.

Экспазіцыя складаецца з 30-і планшэтаў, што знаёмяць з фотаздымкамі, дакументамі, фактамі, картамі, плакатамі, старонкамі перыядычнага друку, сцягамі, замалёўкамі, узнагароднымі лістамі ды іншымі матэрыяламі аб вызваленчым руху Усходняй Еўропы ад нацызму. Унікальныя матэрыялы (у тым ліку і тыя, што доўгі час захоўваліся пад грыфам «зусім сакрэтна») сведчаць пра ход баявых дзеянняў, палітыка-маральны стан часцей Чырвонай Арміі, а таксама пра ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі кіравання па наладжванні інфраструктуры і мірнага жыцця, пра гуманітарную дапамогу, што аказваецца савецкімі салдатамі мясцоваму насельніцтву.

Наведаць выставу можна да 6 красавіка.